**Дзяржаўная ўстанова культуры
“Цэнтралізаваная бібліятэчная сетка
Асіповіцкага раёна”**
***Цэнтральная раённая бібліятэка***

*Серыя «Героі Савецкага Саюза – вызваліцелі Асіповіцкага раёна»*

# У ПАМЯЦІ НАШАЙ ГЕРОІ ЖЫВЫЯ



# РАМАШКА Мікалай Васільевіч

# РАМАШКА
# Мікалай Васільевіч

(13.10.1913 – 30.06.1944)

## БІБЛІЯГРАФІЧНАЯ ДАВЕДКА



**Нарадзіўся 30 верасня (13 кастрычніка) 1913 года ў вёсцы Дусаеўшчына цяпер Капыльскага раёна Мінскай вобласці ў сялянскай сям'і.Скончыў Капыльскую сямігодку і пайшоў працаваць у мясцовы саўгас.**

**У 1935 годзе быў прызваны ў армію. Скончыў школу малодшых камандзіраў ў 1936 годзе і вырашыў працягнуць службу у Чырвонай Арміі.Тут ён прайшоў шлях ад радавога да старшага камандзіра-палітработніка.Член ВКП (б) з 1939 года.**

**На фронце ў Вялікую Айчынную вайну з 1941 года. Змагаўся на Паўночна-Заходнім і 1-м Беларускім франтах. З 22 чэрвеня па 4 студзеня 1943 года быў на фронце намеснікам камандзіра дывізіёназенітнага артпалка па палітчастцы. За баявыя заслугі ўзнагароджаны медалём “За адвагу” і ордэнам Чырвонай Зоркі.**

**Маёр Мікалай Рамашка асабліва вызначыўся ў ходзе стратэгічнай Беларускай аперацыі 1944 года**

пад кодавай назвай “Баграціён”.Загінуў на пераправе праз раку Бярэзіну каля вёскі Свіслач Асіповіцкага раёна Магілёўскай вобласці.

26 кастрычніка 1944 годаУказам Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР Мікалаю Васільевічу Рамашка было пасмяротна прысвоена званне Героя Савецкага Саюза.Пахаваны ў Магілёве на вайсковых могілках.




*Помнік Герою ў г.Магілёве.*

У горадзе Магілёве яго імя занесена ў Кнігу народнай славы, умікрараёне “Рабочы” Кастрычніцкага раёна горада Магілёва, усталявана мемарыяльная дошка.Імем М. В. Рамашка названы вуліцы ў гарадах Капыль, Магілёў, р. п. Ялізава Асіповіцкага раёна і на яго радзіме - у вёсцы Дусаеўшчына Капыльскага р-на. Яго імя было прысвоена піянерскай дружыне Дзяржынскай васьмігадовай школы Капыльскага раёна, на радзіме яму пастаўлены помнік.Помнік Герою ёсць таксама на “Алеі герояў” у г.Асіповічы Магілёўскай вобласці.

# ГІСТОРЫЯ ПОДЗВІГУ

**Знаходзячыся на правым флангу 1-га Беларускага фронту ў складзе 3-й арміі генерала А. В. Гарбатава, зенітна-артылерыйскі полк атрымаў баявую задачу: забяспечыць ахову чыгуначнага мосту праз Бярэзіну ў раёне станцыі Свіслач.**

**На чале з намеснікам камандзірапалка па палітычнай частцы М. В. Рамашка 30 чэрвеня 1944 годана правы бераг Бярэзіны ў раёне моста пераправіліся дзве зенітныя батарэі і рота буйнакаліберных кулямётаў.Зенітчыкі занялі агнявыя пазіцыі. Салдаты яшчэ не паспелі як след акапацца, як іх атакавалі фашысты.**

**Кулямётчыкі, сярод якіх быў Рамашка, першымі адкрылі агонь па ворагу. Першую атаку адбілі, але панеслі страты. Быў забіты камандзір роты Кончын. Рамашка ўзяў камандаванне на сябе.**

**Фашысты некалькі разоў атакавалі зенітчыкаў, пыталіся прарвацца да чыгуначнага мосту каб падарваць яго і затрымаць наступленне Чырвонай Арміі. У гэтым яны бачылі сваё выратаванне. У адной з атак маёру Рамашка далажылі, што забіты камандзір ўзвода, які замяняў кулямётчыка. Мікалай Рамашка сам лёг за кулямёт і моцным агнём сустрэў чарговы ланцуг наступаючых гітлераўцаў. Атакі ворага працягваліся. У зенітчыкаў скончыліся патроны. Радзелі разлікі буйнакаліберных кулямётаў. Параненыя не пакідалі пазіцый, хто мог трымаць карабін -вялі агонь.Вось змоўк кулямёт злева, а**

**затым - справа. Зампаліт маёр Рамашка перабягаў то да аднаго, то да другога кулямёту і вёў агоньпа ворагу. Ён быў паранены. Зрабіўшы перавязку, Рамашка працягваў біць наступаючых гітлераўцаў. Другая рана была цяжкай, але зампаліт, перамагаючы боль, працягваў весці агонь.**

**Салдаты даставілі патроны. Агонь зенітчыкаў узмацніўся і фашысты адыйшлі. Наступіла цішыня.Не чуваць было і голаса камандзіра. Маёр Мікалай Рамашка трымаўся за ручкі кулямёта, быццам гатовячыся да чарговага нападу. Ён быў мёртвы. А перад пазіцыяй зенітчыкаў палка ляжала больш за 200 забітых салдат і афіцэраў праціўніка. Пастаўленая задача была выканана.**



# ЛІТАРАТУРА

1. Зорын, У. Стаялі насмерць (Рамашка М.В.) / У.Зорын // Запаветы Леніна. – 1978. – 4 ліпеня
2. Імем героя: Герой Савецкага Саюза М.В.Рамашка // Запаветы Леніна. - 1974. – 29 чэрвеня
3. Рамашка Мікалай Васільевіч, Герой Савецкага Саюза // Беларусь у Вялікай Айчыннай вайне (1941 1945) : энцыклапедыя. – 1990. – С.524
4. Рамашка М.В. Герой Савецкага Саюза // Бел.ССР : кар. энц. у 5-і т. – Т.5. – Мн., 1981. - С. 513
5. Рамашка М.В., Герой Савецкага саюза // Запаветы Леніна. – 1994. – 25 чэрвеня
6. Ромашко Н.В. // Герои Советского Союза : краткий биограф.словарь. В 2т. Т.2. -- Мн., 1987. -- С.372.
7. Ромашко Николай Васильевич – Герой Советского Союза, отличился при обороне ж/д моста через р.Березина у д.Свислочь// Навечно в сердце народном. -- Мн., 1984. -- С.441--442.
8. Ромашко Николай Васильевич // Их именами названы…: энцикл. справочник. – Мн.:БелСЭ, 1987. – С.521
9. Ромашко Николай Васильевич[Электронный ресурс] / Герои страны : интернет проект. –

Минск, 2000-2013. – Режим доступа :http://www.warheroes.ru

10. Ромашко Николай Васильевич/ Электронный банк документов «Подвиг народа в Великой Отечественной войне 1941-1945 гг. – Режим доступа :http://www.podvignaroda.mil.ru
11. Салаўёў, М. Крокі ў бессмяротнасць / М. Салаўёў // Запаветы Леніна. – 1985. – 15 студзеня
12. Салаўёў, М. Подзвіг на Бярэзіне / М. Салаўёў // Запаветы Леніна. – 1973. – 25 снежня
13. Чарвякоў, П. Адзін з герояў / П.Чарвякоў // Запаветы Леніна. – 1994. – 13 красавіка
14. Червяков, П. Память о героях бессмертна: Герой Советского Союза майор Николай Васильевич Ромашко / П.Червяков // Запаветы Ленина. – 1999. – 8 мая